# ПЕРАВЕРНУТЫ КЛАС: ПЛЮСЫ І МІНУСЫ

**Бурдыка П.В.**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

Сёння амаль кожны настаўнік школы і выкладчык вуза чуў пра такую мадэль адукацыйнага працэсу як “перавернуты клас”.

Пачынальнікамі мадэлі перавернутага класа лічацца настаўнікі Джонатан Бергман і Аарон Сэмс, якія ў 2007 годзе прыдумалі, як забяспечыць сваімі лекцыямі спартсменаў, якія вымушаны часта адсутнічаць на занятках, а пасля развілі сваю ідэю ў новы адукацыйны напрамак.

Перавернуты клас – гэта інвацыйны сцэнар навучання, які стаў папулярным дзякуючы магчымасцям сучасных гаджэтаў. Перавернуты клас ставіць традыцыйнае навучанне з ног на галаву: спачатку ідзе хатняе заданне, а ўжо потым праца ў класе/аўдыторыі. Атрымаўшы папярэднія веды, студэнты ўваходзяць у перавернуты клас гатовыя працаваць. Час, які традыцыйна прызначаны для перадачы інфармацыі, выкарыстоўваецца для практычнага замацавання матэрыялу. Выкладчыкі накіроўваюць студэнтаў, якія выконваюць класныя заданні, абапіраючыся на тое, што даведаліся па-за класам.

Для перавернутага навучання характэрна выкарыстанне вадкастаў, падкастаў і прывадкастаў.

Падкаст – гэта нейкі гукавы файл (напрыклад, аўдыёлекцыя), які выкладчык рассылае студэнтам, якія, у сваю чаргу, спампоўваць яго на свае стацыянарныя альбо мабільныя прылады, ці слухаюць лекцыя анлайн.

Вадкаст – гэта тое ж самае, што і падкаст, але гаворка ўжо ідзе пра відэафайлы.

Прывадкастынг – гэта адукацыйны метад, у якім выкладчык стварае вадкаст са сваёй лекцыяй, каб навучэнцы атрымалі ўяўленне аб тэме яшчэ да занятку, на якім гэта тэма будзе разгледжана. Метад прывадкастынга – гэта першапачатковая назва метаду перавернутага класу.

Але ж ці сапраўды гэта мадэль адукацыйнага працэсу працуе?

*Плюсы перавернутага класа:*

1. Значная эканомія часу. Па меркаванні заснавальнікаў метаду, выкладчык не марнуе час на тлумачэнне матэрыялу ў аўдыторыі.
2. Пры вывучэнні матэрыялу студэнты вучацца думаць крытычна, самастойна, дакладна ведаюць, як прымяняць веды на практыцы.
3. Больш індывідуальны падыход. Кожнаму чалавеку неабходны пэўны час на апрацоўку інфармацыі. Аднаму дастаткова толькі раз праслухаць лекцыю, а іншаму спатрэбіцца некалькі разоў. У гэтым выпадку студэнт мае магчымасць надаваць падтыхтоўцы столькі часу, колькі трэба, каб добра засвоіць матэрыял.
4. Выдатна падыходзіць для паўтарэння, бо заўсёды можна вярнуцца да той ці іншай лекцыі ў любы час.
5. Адсутнасць неабходнасці тлумачыць матэрыял тым, хто адсутнічаў на занятках. Можна паглядзець відэа альбо паслухаць аўдыё.

*Мінусы перавернутага класа*

1. Карэкціроўка адукацыйных праграм і працаёмкасць стварэння аўдыа/відэалекцый для выкладчыка, які павінен быць тэхнічна падкаваным.
2. Гэты метад не падыходзіць для нематываваных студэнтаў. Калі яны ўсяляк імкнуцца пазбегнуць выканання “звычайнага” хатняга задання, то наўрад ці будуць загадзя знаёміцца з новым матэрыялам.

І ў гэтым выпадку вельмі цяжка працаваць выкладчыку, калі толькі палова студэнтаў падрыхтавалася.

3. Трэба памятаць, што не ўсе студэнты прывыклі самастойна працаваць, ім нязвыкла вывучаць новы матэрыял без выкладчыка. Падчас перавернутага падыхода самі студэнты адказны за свой навучальны працэс. Але ж нажаль, не ўсе сённяшнія студэнты гатовыя ўзяць на сябе гэтую адказнасць.

Перавернутыя класы маюць як плюсы, так і мінусы. З аднаго боку, яны дапамагаюць настаўнікам з'эканоміць час на занятках, адначасова спрыяючы ўцягванню студэнтыў у навучальны працэс. З іншага боку, яны могуць павялічыць час падрыхтоўкі выкладчыкаў, а таксама стаць праблемай для студэнтаў. Але ж у цэлым, многія педагогі лічаць, што перавернутыя класы маюць больш плюсаў, чым недахопаў.

**Літаратура**

1. Betihavas, V., Bridgman, H., Kornhaber, R., & Cross, M. The evidence for 'flipping out': A systematic review of the flipped classroom in nursing education. *Nurse Education Today*, *6*, 15–21. – 2015.

2. Bishop, J. L., & Verleger, M. A. (2013). The flipped classroom: a survey of the research. In *ASEE National Conference Proceedings, Atlanta, GA*. – 2013.

3. Butt, A. Student views on the use of a flipped classroom approach: evidence from Australia. *Business Education & Accreditation, 6*(1), 33–43. – 2014.